**Валянціна Бігеза**



**Кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

**Ніна Ляйко**



**Кандыдат гістарычных навук, дацэнт**

**Сафія Паўлава**



**Кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

# ПРАЗ ПРЫЗМУ ЧАСУ: ГІСТАРЫЧНЫЯ АСПЕКТЫ ПАДРЫХТОЎКІ БІБЛІЯТЭЧНЫХ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ПА РАБОЦЕ З ДЗЕЦЬМІ



Падрыхтоўка кадраў для дзіцячых і школьных бібліятэк пачалася ў сярэдзіне 60-х гг. XX ст., пасля пастановы ЦК КПБ «О мерах по улучшению работы библиотек республики» (лістапад 1959 г.). У адпаведнасці з пастановай неабходна было палепшыць падбор, расстаноўку і выхаванне бібліятэчных кадраў у нашай краіне, укамплектаваць спецыялістамі, пераважна з вышэйшай адукацыяй, абласныя, гарадскія, раённыя, дзіцячыя, навуковыя бібліятэкі і бібліятэкі вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў [1]. Пры падрыхтоўцы бібліятэчных кадраў спецыялізацыі «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі» значная ўвага надавалася вывучэнню педагогікі і псіхалогіі, дзіцячай мастацкай і навукова-пазнавальнай літаратуры, кіраўніцтву чытаннем дзяцей і падлеткаў, бібліяграфіі дзіцячай літаратуры і інш.

Новы этап у падрыхтоўцы кадраў для дзіцячых і школьных бібліятэк пачаўся пасля адкрыцця кафедры дзіцячай літаратуры і бібліятэчнай работы з дзецьмі (чэрвень 1977 г.). Загадчыцай кафедры была прызначана З. Клецкая, кандыдат педагагічных навук, дацэнт. На кафедры працавалі: кандыдаты філалагічных навук, дацэнты В. Бігеза, С. Паўлава; кандыдаты педагагічных навук, дацэнты В. Варапаева, Л. Дзямешка, Т. Куцанава; кандыдат гістарычных навук, дацэнт Н. Ляйко; старшы выкладчык В. Дзмітрыева. Усе выкладчыкі займаліся навуковым

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

даследаваннем дзейнасці дзіцячых і школьных бібліятэк па розных накірунках.

Сістэмнае напаўненне вучэбнага плана прадугледжвала комплекс дысцыплін, якія забяспечвалі падрыхтоўку студэнтаў спецыялізацыі «дзіцячыя і школьныя бібліятэкі».

Большая частка студэнтаў працавала ў навуковых гуртках, мела зносіны з вядомымі бібліятэкарамі-практыкамі, «працавала» ў бібліятэках, спрабуючы сябе ў рабоце з юнымі чытачамі. Навуковыя канферэнцыі для ўсіх студэнтаў пераўтвараліся ў свята прафесіі. Можна канстатаваць, што амаль кожны студэнт гэтай кафедры, за рэдкім выключэннем, праходзіў школу навуковага пошуку. Менавіта ў тыя гады стваралася атмасфера, якая стала традыцыяй спецыялізацыі – глыбокая ўзаемасувязь навучання з практыкай, з даследаваннем яе новых магчымасцей. Быў і іншы бок такіх прафесійных зносін – нефармальны, мэтанакіраваны вопыт прафарыентацыйнай работы. Гэтая традыцыя плённа развіваецца і цяпер.

Яшчэ адна істотная асаблівасць, закладзеная з заснавання кафедры: практыка-арыентаваная накіраванасць навучання. У аснову яе былі пакладзены наступныя патрабаванні: дамагацца ў выкладанні кожнага спецыяльнага прадмета цеснага ўзаемадзеяння тэорыі і практыкі; забяспечваць сувязь паміж асобнымі формамі спецыяльнай падрыхтоўкі (лекцыямі, семінарамі і практычнымі заняткамі ў інстытуце і працай студэнтаў у дзіцячых бібліятэках) па ўсіх прадметах; звяртаць вялікую ўвагу на самастойную працу, практычныя заняткі кожнага студэнта, прытрымлівацца паслядоўнасці і пераемнасці ў іх распрацоўцы па лініі нарастаючай складанасці; ажыццяўляць паслядоўнасць вытворчых практык у асноўных тыпах дзіцячых бібліятэк (школьнай, гарадской, раённай, абласной).

Ужо тады быў дакладна вызначаны тып баз вучэбнай і вытворчай практыкі студэнтаў. На першым годзе навучання – экскурсійная практыка ў бібліятэках паралельна з вывучэннем пытанняў кіраўніцтва чытаннем дзяцей, далей вытворчая практыка ў раённых і гарадскіх бібліятэках Мінска і абласных бібліятэках рэспублікі.

Безумоўна, у падрыхтоўцы кваліфікаванага спецыяліста асаблівае месца займае вытворчая практыка ў дзіцячых бібліятэках, падчас якой студэнты вучацца педагагічным зносінам з чытачамі-дзецьмі, замацоўваюць веды, правяраюць тэарэтычную падрыхтоўку. У гэтай працы нам дапамагалі і дапамагаюць творчыя супрацоўнікі Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк і іншых бібліятэк краіны.

Актыўную работу праводзілі студэнты і выкладчыкі ў час вытворчай практыкі ў абласных (Гродзенскай, Магілёўскай, Мінскай) і раённых (Барысаўскай, Жодзінскай, Маладзечанскай, Слуцкай) дзіцячых бібліятэках. Студэнты не толькі абслугоўвалі карыстальнікаў, праводзілі масавыя мерапрыемствы, але рыхтавалі і публікавалі метадычныя распрацоўкі (пад кіраўніцтвам супрацоўнікаў бібліятэк) для бібліятэкараў дзіцячых бібліятэк, прысвечаныя знамянальным падзеям.

Падкрэслім, што у той перыяд студэнты не толькі вывучалі дысцыпліны, прадугледжаныя вучэбным планам, але і прымалі актыўны ўдзел у грамадскім жыцці, праводзілі шэраг мерапрыемстваў па творчасці пісьменнікаў як ва ўніверсітэце, так і за яго межамі ва ўмовах дзіцячых бібліятэк – не толькі ў сталіцы, але і ў іншых гарадах краіны. Ва ўніверсітэце неаднаразова праводзіліся прэзентацыі кніг, сустрэчы з пісьменнікамі і паэтамі (С. Шушкевічам, А. Вольскім, У. Ліпскім, Г. Пашковым), арганізоўваліся клубы па інтарэсах, дыскусіі «Прафесія бібліятэкара вачыма першакурсніка і выпускніка» і інш.

Сёння пры падрыхтоўцы спецыялістаў для дзіцячых і школьных бібліятэк акрамя сацыяльна-гуманітарных, агульнапрафесіянальных і спецыяльных дысцыплін вывучаюцца дысцыпліны «Бібліяграфія дзіцячай літаратуры для дзяцей і юнацтва», «Сусветная літаратура для дзяцей і юнацтва», «Беларуская літаратура для дзяцей», «Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва», «Сацыялогія і псіхалогія дзіцячага чытання», «Фарміраванне інфармацыйных рэсурсаў дзіцячых і школьных бібліятэк», «Фарміраванне інфармацыйнай культуры школьнікаў». Такім чынам паглыбляюцца псіхолага-педагагічныя веды студэнтаў адносна валодання прыёмамі вывучэння і вырашэння псіхалагічных праблем чытання і звязаных з імі бібліятэчных зносін.

На працягу ўсёй дзейнасці кафедры студэнты арыентуюцца быць чулымі да таго, як рэалізуе свой духоўны патэнцыял асоба сучаснага юнага чытача. Таму выкладчыкаў спецыялізацыі адрознівае пастаянны пошук і імкненне удасканальваць методыку выкладання. Распрацаваны творчыя заняткі, спісы літаратуры, сістэма самастойнай адпрацоўкі ключавых праблем кожнай вучэбнай дысцыпліны.

Больш эфектыўнаму засваенню дысцыплін спрыяе таксама выкарыстанне рэйтынгавай сістэмы кантролю ведаў студэнтаў, распрацаванай на ФІДК дацэнтамі В. Бігезай і В. Касап. У сувязі з гэтым паглыбляецца і сістэма прафесійнага чытання студэнтаў. Падкрэслім таксама, што псіхолага-педагагічная сутнасць бібліятэчнай працы з дзецьмі акцэнтуецца ў выкладанні ўсіх спецыяльных дысцыплін і дысцыплін спецыялізацыі.

Практычная накіраванасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў, развіццё і ўмацаванне ўзаемадзеяння з бібліятэкамі прывялі некалькі гадоў таму назад да стварэння вучэбна-навукова-вытворчых комплексаў. На кафедры менеджменту ІДК В. Бігезай было распрацавана Палажэнне аб такім комплексе. Яно стала асновай для арганізацыі дзелавога супрацоўніцтва кафедры і Цэнтралізаванай сістэмы дзіцячых бібліятэк Мінска. У ім прадугледжаны пытанні размеркавання спецыялістаў, выканання курсавых, дыпломных, магістарскіх прац па заказах бібліятэк, рашэнні праблемных сітуацый бібліятэчнай практыкі, удзел выкладчыкаў у павышэнні кваліфікацыі спецыялістаў бібліятэчнай справы, абагульненне перадавога вопыту бібліятэк і г. д.

Сумесная праца кафедры і базы вучэбна-навукова-вытворчага комплексу накіравана на фарміраванне мадэлі спецыяліста, якая адказвае патрабаванням грамадства, і на канкрэтную яе рэалізацыю ў працэсе навучання і выхавання студэнтаў.

На сучасным этапе кампетэнтнасны падыход стаў дамінуючым у падрыхтоўцы спецыялістаў па рабоце з дзецьмі. Фарміраванне і развіццё кампетэнцый у выпускніка не можа быць рэалізавана толькі выкладаннем вучэбных дысцiплін. Не менш важнай складаючай з'яўляецца ўкараненне адпаведных арганізацыйных форм навучальнага працэсу, інавацыйных педагагічных сістэм і тэхналогій, методык

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

актыўнага і інтэрактыўнага навучання.

Пры рэалізацыі інтэрактыўных метадаў дамінуе, у адрозненне ад тлумачальна-ілюстрацыйных метадаў, не дзейнасць выкладчыка, а дзейнасць студэнта. Выкладчык не з'яўляецца транслятарам гатовай інфармацыі, а арганізуе самастойную пазнавальную дзейнасць студэнта па прадуцыраванні ведаў аб навакольнай рэчаіснасці, будзіць да пошуку, даследаванню з'яў і працэсаў, самастойнага рашэння праблем. Выкладчык выступае як крыніца інфармацыі. Яго функцыя – стварэнне ўмоў для праяўлення актыўнасці, ініцыятывы, арганізацыя мыслядзейнасці, сэнсатворчасці, рэфлексіўнай дзейнасці навучэнцаў.

Актыўнасці студэнтаў садзейнічае і спалучэнне ў інтэрактыўных метадах агульных арганізацыйных форм педагагічнага ўзаемадзеяння: франтальнай, групавой, парнай і індывідуальнай.

Засваенне студэнтамі спецыяльных дысціплін здзяйсняецца праз разнастайныя формы навучання. У іх пошуку і апрабацыі кафедра лічыць найбольш эфектыўным выкарыстанне тэхналогій праектнага навучання, якія вызначаюцца з пункту гледжання педагогікі як «сукупнасці прыёмаў, дзеянняў навучэнцаў у іх пэўнай паслядоўнасці для дасягнення пастаўленай задачы – рашэння праблемы, значнай для навучэнцаў і афармленай у выглядзе канчатковага прадукта» [3].

Адукацыйны праект – гэта форма арганізацыі заняткаў, якая прадугледжвае комплексны характар дзейнасці ўсіх яго ўдзельнікаў на атрыманне канкрэтных вынікаў, вырашэнне той ці іншай тэарэтычнай або практычнай праблемы. Метад праектаў заўсёды арыентаваны на самастойную дзейнасць студэнтаў – індывідуальную, парную, групавую, якую яны выконваюць на працягу вызначанага часу. Гэты метад арганічна спалучаецца з групавым падыходам да навучання і заўсёды прадугледжвае рашэнне якой-небудзь праблемы. А рашэнне праблемы прадугледжвае, з аднаго боку, выкарыстанне сукупнасці разнастайных метадаў і сродкаў навучання, з другога – інтэграванне ведаў і ўменняў з розных сфер навукі, тэхналогіі. Вынікі праектаў павінны быць «датыкальнымі»: калі гэта тэарэтычная праблема – то канкрэтнае яе рашэнне, калі практычная – канкрэтны вынік. Увогуле можна сказаць, што праектнае навучанне – гэта інтэрактыўны метад навучання.

Выбар тэматыкі праектаў у розных сітуацыях можа быць розным. Як правіла, тэматыка закладаецца падчас педагагічнага праектавання дысцыпліны. Гэта папярэдні этап праектнага навучання, калі ствараецца мадэль дысцыпліны – рабочая праграма, дзе ўсебакова раскрываецца яе значэнне для дадзенай спецыяльнасці, міжпрадметныя сувязі, аб'ём, змест тэарэтычнай і практычнай частак, формы арганізацыі вучэбнага працэсу, кантроля і тэхналогіі. Акрамя праграм, на кафедры распрацаваны вучэбна-метадычныя дапаможнікі і іншыя дыдактычныя матэрыялы, напаўняльнасць якіх сведчыць аб тым, што яны распрацаваны адпаведна прынцыпам праектавання.

Праілюструем гэты працэс падрабязна на прыкладзе выкладання спецыяльных дысцыплін «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент», «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк». Тэхналогія правядзення заняткаў уяўляе комплекс і паслядоўнасць рэалізацыі разнастайных інтэрактыўных метадаў, арганізацыі ўзаемадзеяння выкладчыка і студэнтаў праз рэалізацыю сукупнасці інтэрактыўных метадаў у мэтах больш аптымальнага развіцця ўдзельнікаў педагагічнага працэсу. Пачынаецца гэта з рэалізацыі якога-небудзь інтэрактыўнага метада па стварэнні добразычлівай атмасферы, арганізацыі камунікацыі: «Завяршы фразу», «Алітэрацыя імён», «Камплімент». Гэтыя метады рэалізуюцца на працягу 5–10 хвілін і даюць магчымасць студэнтам аператыўна ўключыцца ў дзейнасць, развіваюць станоўчую матывацыю да дзейнасці [2, с. 53–55].

Эфектыўным метадам падрыхтоўкі спецыялістаў з'яўляецца «Работа з паняццямі». Яе прызначэнне – асэнсаванне студэнтамі паняццяў, каштоўнасных арыентацый, стварэнне кожным удзельнікам педагагічнага працэсу свайго індывідуальнага разумення таго ці іншага паняцця, абмен імі. Метад рэалізуецца праз некалькі этапаў. Па-першае, гэта вызначэнне паняцця. На гэтым этапе выкладчык прапануе студэнтам работу з даведачнай літаратурай, у якой яны знаходзяць універсальнае вызначэнне і запісваюць яго ў слоўнік. На другім этапе адбываецца падбор падобных (па аднаму з кожнай тэмы) паняццяў. На трэцім этапе падбіраюцца супрацьлеглыя паняцці. Складаецца ўласны тлумачальны слоўнік. У выніку кожны слоўнік уяўляе сабой монапраект па дысцыпліне і з'яўляецца асновай для яе вывучэння.

Сацыяльна-псіхалагічная падрыхтоўка студэнтаў у межах спецыяльных дысцыплін прадугледжвае выкарыстанне ролявых інтэрактыўных праектаў. Агульнае, што іх аб'ядноўвае, – разбор канкрэтных, часта канфліктных сітуацый у сферы міжасобасных стасункаў. Падбор, складанне праблемных сітуацыйных задач адбываецца па заданні выкладчыка ў міжсесійны перыяд з дапамогай студэнтаў-завочнікаў. Перад імі ставіцца задача апісаць сітуацыю ў бібліятэцы, удзельнікамі або сведкамі якой яны былі. Сітуацыйныя задачы павінны адказваць наступным патрабаванням: сітуацыя павінна быць спрэчнай і цікавай, у аснове павінен быць рэальны факт. Пры гэтым, з пункту гледжання студэнтаў, яны павінны быць трох відаў:

• сітуацыя, калі дзеянні бібліятэкара можна ацаніць як аптымальныя;
• сітуацыя, у якой яўная памылка бібліятэкара;
• спрэчная, неясная сітуацыя, рашэнне якой выклікае сумненне.

Як правіла, студэнты-завочнікі паспяхова спраўляюцца з заданнем, і мы атрымліваем багаты фактычны матэрыял для складання задач не толькі для студэнтаў ФЗН, але і дзённага аддзялення. Было складзена тры віды праблемных сітуацыйных задач. Першы від дае апісанне сітуацыі і шэраг магчымых варыянтаў рашэння. Студэнту неабходна абгрунтаваць прымальныя і непрымальныя варыянты. Другі від дае ацэнку паводзінам бібліятэкара падчас абслугоўвання ў канкрэтнай сутуацыі, студэнту неабходна правесці аналіз і даць абгрунтаванае рашэнне. Трэці від задач арыентаваны на пошук самастойнага рашэння з абгрунтаваннем. Падобныя задачы патрабуюць ведання бібліятэчнага заканадаўства (аб захаванасці фондаў бібліятэк), педагагічнага такту, павагі да асобы чытача, індывідуальнага падыходу ў кожным канкрэтным выпадку. Пасля выступлення ўсіх, хто рашыў задачу № 1, пачынаецца абмеркаванне па прапанаваным параметрам. Затым алгарытм абмеркавання другой і трэцяй задач паўтараецца. Студэнты зацікаўлена ацэньваюць рашэнні сваіх



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сяброў, выказваюць сваё меркаванне. Пры гэтым узнікаюць спрэчкі, «барацьба» поглядаў. Пад кіраўніцтвам выкладчыка знаходзіцца правільнае рашэнне, абмяркоўваюцца памылкі, якія дапускаліся студэнтамі.

Высокую інтэнсіўнасць камунікацыі ўдзельнікаў педагагічнага працэсу забяспечвае і вырашэнне канфліктных сітуацый у бібліятэчным калактыве. Студэнты знаёмяцца з рознымі канфліктнымі сітуацыямі і фарміруюць мадэль вырашэння маральных канфліктаў. Далей індывідуальныя варыянты публічна аргументуюцца і абмяркоўваюцца.

Адзін з модуляў дысцыпліны «Абслугоўванне карыстальнікаў бібліятэк» уключае тэму «Выставачная дзейнасць бібліятэк», дзе прадугледжана арганізацыйна-дзеясная гульня «Мадэль бібліятэчнай выставы». Гэта метад інтэгрыруе ўсе папярэднія метады. Падчас правядзення гульні развіваюцца навыкі крытычнага асэнсавання рэчаіснасці, набываецца вопыт калектыўнай інтэлектуальнай дзейнасці, удасканальваюцца ўменні працаваць з мэтавымі чытацкімі групамі; развіваюцца ўменні аналітыка-сінтэтычнай работы з інфармацыяй. Гульня праходзіць у чатыры этапы, займае 4 гадзіны аўдыторнага часу. Першы этап – тэарэтычная частка занятка, дзе выкладчык нагадвае патрабаванні да выставачнай дзейнасці, нагадвае іх класіфікацыю, тлумачацца асноўныя паняцці тэмы (студэнты выкарыстоўваюць свае слоўнікі). На другім этапе адбываецца падрыхтоўка праектаў. Удзельнікі гульні падзяляюцца на дзве каманды. Кожная каманда прадстаўляе пэўную бібліятэку (дзіцячую або дарослую) і атрымлівае спецыяльную матрыцу, па выніках калектыўнага запаўнення якой ствараецца знакавая мадэль выставы. На работу даецца 45 хвілін. Удзельнікам дазваляецца выкарыстоўваць розныя крыніцы інфармацыі. На трэцім этапе праходзіць абарона праектаў. Кожная каманда прадстаўляе калектыўныя праекты, удзельнікі слухаюць выступленні, задаюць пытанні, дапаўняюць, робяць каментарыі па ходу гульні. На заключным этапе – падвядзенне вынікаў. Вядучы выяўляе праблемы, якія ўзніклі ў камандах, дае практычныя рэкамендацыі. Вынікі гульні выкарыстоўваюцца ў якасці асновы для метадычных распрацовак тэматычных выстаў па розных кірунках дзейнасці ў інтэграваным курсе «Бібліятэчна-інфармацыйны менеджмент». Гэты курс завяршае ў вучэбным плане цыкл спецыяльных бібліятэказнаўчых дысцыплін. Ён сінтэзуе і абагульняе веды студэнтаў па асобных напрамках бібліятэчнай дзейнасці, а таксама інтэгрыруе ўсе інтэрактыўныя метады. Па тэме курса «Бібліятэка ў сістэме сацыяльна-культурнага праграміравання» прадугледжана распрацоўка студэнтамі мульціпраекта.

У ходзе лекцый і семінарскіх заняткаў студэнты замацоўваюць веды па праектнай дзейнасці бібліятэк, на практычных занятках разглядаюць розныя праблемныя сітуацыі, удакладняюць мэты, задачы, тэрміны працы над праектамі, распрацоўваюць мадэль мэтавай праграмы.

Тэхналогію інтэрактыўнага праектнага навучання нездарма адносяць да інтэрактыўных тэхналогій XXI ст., яна, па-першае, прадугледжвае ўменне адаптавацца да імкліва зменлівых умоў жыцця чалавека постіндустрыяльнага грамадства. А па-другое, праекты разглядаюцца як элементы сістэмы адукацыйнай стратэгіі, пабудаванай у адным мэтавым кірунку. Выкарыстанне інтэрактыўных тэхналогій навучання дазваляе ўдасканальваць арганізацыю самастойнай работы студэнтаў-завочнікаў, зрабіць яе больш рытмічнай, а ў выніку і павысіць паспяховасць. Безумоўна, кожны выкладчык выбірае сваю сістэму навучання з улікам вучэбных метадаў і задач, асаблівасцей вучэбнай групы, інтарэсаў і патрэб, кампетэнтнасці і іншых фактараў. Найбольшага эфекту можна дасягнуць пры сістэмным падыходзе да выбару традыцыйных і інавацыйных тэхналогій навучання, пры іх спалучэнні, дапаўненні адзін аднаго і пры эфектыўным кіраўніцтве з боку выкладчыка.

Спецыялізацыя «Бібліятэчнае абслугоўванне дзяцей і юнацтва» прайшла эвалюцыйны шлях у сваім развіцці, які ў наш час звязаны з пераарыентацыяй працэсу навучання шляхам прымянення кампетэнтнаснага падыходу, што накіраваны на развіццё прафесіянала і асобы. Вучэбны працэс і практыка-арыентаваная падрыхтоўка бібліятэчных спецыялістаў па рабоце з дзецьмі – бесперапынныя ў фарміраванні прафесійных кампетэнцый, а гэта ў сваю чаргу вымагае навуковы і метадычны пошук супрацоўніцтва з бібліятэкамі, а з боку вышэйшых навучальных устаноў – пошук новых, сучасных прыёмаў інавацыйнага навучання і спосабаў развіцця творчага мыслення студэнтаў, іадносін да абранай прафесіі.

Думаецца, што сучасная перабудова сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў нашай краіне адродзіць спецыялізацыю, уздыме на новы ўзровень значнасць падрыхтоўкі бібліятэчных спецыялістаў для дзіцячых і школьныхбібліятэк.



ЛІТАРАТУРА

1. **О мерах** по улучшению работы библиотек республики: постановление ЦК КПБ (ноябрь 1959 г.) // ПА ИИП при ЦК КПБ, фонд 4. – Оп. 81. – Д. 1450. – Л. 85.

2. **Педагогическое** образование в Республике Беларусь: аналитические материалы : практ. пособие / М-во образования Респ. Беларусь, УО «Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка» ; [П.Д. Кухарчик и др. ; под общ. ред. И.И. Цыркуна]. – Минск : БГПУ, 2007. – 234 с.

3. **Цыркун, И.И.** Инновационное образование педагога: на пути к профессиональному творчеству : учеб.-метод. пособие / И.И. Цыркун, Е.И. Карпович ; М-во образования Респ. Беларусь, УО «Белорусский государственный педагогический университет им. М. Танка». – 2-е изд. – Минск : БГПУ, 2011. – 309 с.

Summary

The article describes the history of children's librarian training.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ